



# ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ «АД СПАДЧЫНЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ – ДА СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ»

**Аўтары:** навучэнцы ДУА «Зенькавіцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Уздзенскага раёна» Мінскай вобласці.

**Кіраўнік:** Тоўстая Людміла Мікалаеўна, настаўнік геаграфіі і гісторыі.

**Мэта экскурсіі:** садзейнічаць выхаванню пачуцця патрыятызму, любві і павагі да Радзімы, роднага краю.

**Задачы экскурсіі:**

пазнаёміць экскурсантаў з выдатнымі мясцінамі Уздзеншчыны і сумежных раёнаў;

паказаць ролю традыцый, звычаяў у развіцці беларускай культуры, паказаць асаблівасці этнічнай культуры, побыту малой радзімы і Беларусі;

выхоўваць беражлівыя адносіны і павагу да беларускай культуры.

**Від экскурсіі:** аўтобусная

**Працягласць:** 7 гадзін (без затраты на дарогу)

**Маршрут экскурсіі:** месца сустрэчы з групай Мінская вобласць, Узденскі раён, агр.Зенькавічы, завулак Школьны (будынак школы).

ДУА "Зенькавічскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя А.І.Якімовіча" - Зенькавіцкі Дом культуры - Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей - Царква Святых апосталаў Пятра  Паўла - В.Дудзічы Пухавіцкага раёна - Музейны комплекс «Дудуткі» - в.Азярцо Мінскага раёна - Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

**Змест экскурсіі:**

Дадзены культурна-пазнавальны экскурсійны маршрут распрацаваны з выкарыстаннем этнічных асаблівасцей Беларусі, у тым ліку Мінскай вобласці і яе цэнтральных раёнаў – Уздзенскага, Пухавіцкага і Мінскага. Маршрут пазнаёміць экскурсантаў з народнымі традыцыямі, звычаямі, абрадамі беларусаў, дазволіць дакрануцца да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа на прыкладзе народных рамёстваў, фальклорных асаблівасцей, ежы, адзення і інш.

У час падарожжа можна даведацца пра жыццё, побыт і культуру беларусаў, пазнаёміцца з узорамі народнай архітэктуры, акунуцца ў цікавы і разнастайны свет народнага майстэрства і творчасці, прайсціся сцежкамі

вёсак розных куткоў Беларусі і сваёй малой радзімы, адпачыць у маляўнічых куточках прыроды.

Пачнецца экскурсійны маршрут у музеі ўстановы адукацыі, пройдзе па Уздзеншчыне, пухавіцкай зямлі і закончыцца ў Мінскім раёне.

Выбраны ён не выпадкова, бо наша малая радзіма – Уздзеншчына налічвае больш 150 помнікаў гісторыі, археалогіі і архітэктуры мясцовага значэння, маюцца і рэспубліканскія каштоўнасці: курганны могільнік IX-XII стст., кальвінскі збор, сядзібна-паркавыя комплексы «Кухцічы», «Таўкачэвічы», сядзіба «Наднёман». Цікавы і касцёл Святога Крыжа, і царква Святых апосталаў Пятра і Паўла ў горадзе Узда.

Не менш цікавымі аб’ектамі культуры багаты нашы суседзі – Пухавіцкі і Мінскі раёны.

Гісторыя і культура нашай краіны складалася стагоддзямі, іх ствараў народ. Гэта можна прасачыць не толькі ў буйных гарадах, якія валодаюць вялікімі славутасцямі. Практычна кожны сельскі населены пункт, невялікі пасёлак або гарадок у Мінскай вобласці, мае сваю самабытнасць і захоўвае ў сабе культуру беларускага народа. Захоўвае гэта і Уздзенская зямля. Наш культурна-пазнавальны маршрут пракладзены так, каб наведаць аграгарадкі і іншыя населеныя пункты Мінскай вобласці, пра якія, магчыма, многія суайчыннікі не ведаюць і нават не чулі. А таксама зазірнуць у добра вядомыя музеі Міншчыны.

# ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ
# «АД СПАДЧЫНЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ – ДА СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ»

| **Маршрут экскурсіі** | **Прыпынкі** | **Аб’екты паказу** | **Працягласць экскурсіі** | **Назва падтэм і пералік асноўных пытанняў** |
|---|---|---|---|---|
| Месца прыёму групы | Школы в.Зенькавічы, перад цэнтральным уваходам у двор | | | |
| агр. Зенькавічы Уздзенскага раёна | Двор установы адукацыі | Панарамы школы | 10 мін. | аг.Зенькавічы, школы, геаграфічнае становішча, гісторыя, сучасны выгляд. |
| | Літаратурна-краязнаўчы музей установы адукацыі | Этнаграфічны аддзел музея | 40 мін. | Агульныя звесткі пра музей.<br>Агляд экспазіцый.<br>Расказ пра музейныя прадметы.<br>Расказ пра традыцыі і звычаі Уздзеншчыны.<br>Майстар-клас па рабоце з прадметамі побыту (прасам, качалкай і інш.). |
| | Актавая зала ўстановы адукацыі | Выстава-кірмаш «Гасцінцы нашых бабуль». | 30 мін. | Знаёмства з ежай сельскай мясцовасці, продаж салодкай прадукцыі, створанай па рэцэптах бабуль. |
| *Лагічны пераход: Зенькавіцкі Док культуры знаходзіцца ў 800 метрах ад школы, у цэнтры ААТ «Уздзенскі». Пабудаваны ў 60-х гадах XX ст.* | | | | |
| | Зенькавіцкі Дом культуры | Выстаўка «Рук залатых зямныя цуды».<br>Традыцыі вёскі. Беларускія народныя песні. | 30 мін.<br><br><br>20 мін.<br>20 мін. | Агульныя звесткі пра майстроў вёскі.<br>Сустрэча з майстрамі вышыўкі, пляцення і інш.<br>Агляд выставы.<br>Знаёмства з традыцыямі вёскі.<br>Развучванне беларускіх народных песень. |
| *Лагічны пераход: у 4 км ад аг.Зенькавічы знаходзіцца раённы цэнтр г.Узда,<br>дзе мы наведаем гісторыка-краязнаўчы музей і разгледзім царкву Святых апосталаў Пятра і Паўла.* | | | | |
| На шляху следавання да Узды | | Панарама з вокнаў аўтобуса | | Коратка расказаць гісторыю Уздзенскага раёна. |
| Горад Узда | На стаянцы пабач з музеем | Панарама музея і наваколля | 10 мін. | Узда – старажытны горад Беларусі. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей | 40 мін. | Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей – навукова-даследчая і выхаваўчая ўстанова культуры: агляд экспазіцый музея, наведванне «Хаткі ганчара». |
| *Лагічны пераход: у трох хвілінах язды ад музея знаходзіцца царква Святых апосталаў Пятра і Паўла – помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя.* | | | | |
| | На стаянцы побач з царквой | Царква Святых апосталаў Пятра Паўла | 10 мін. | Царква Святых апосталаў Пятра і Паўла – пабудова 1905 г. па праекце епархіяльнага архітэктара У.І.Струева.<br>Расказаць пра гісторыю будаўніцтва царквы, асаблівасцях архітэктуры, пра свяшчэннікаў царквы. |
| *Лагічны пераход: у 60 кіламетрах ад Узды ў Пухавіцкім раёне побач з вёскай Пціч знаходзіцца музейны комплекс старажытных промыслаў* «Дудуткі». | | | | |
| На шляху следавання да Дудзіч | | Панарама з вокнаў аўтобуса | | Коратка расказаць пра этнаграфічныя асаблівасці Уздзенскага раёна. |
| В.Дудзічы Пухавіцкага раёна | Стаянка музейнага комплекса «Дудуткі» | Аглядавая экскурсія па музею пад адкрытым небам | 1 г. 30 мін. | Наведванне аб'ектаў музея: млына, хаткі завозніка, храма, бровара, птушынага двара.<br>Знаёмства з майстэрнямі: дрэваапрацоўкі, ткацтва, кузняй, ганчарства, пякарняй.<br>Наведванне карчмы, бара «Шынок» (па жаданні). |
| *Лагічны пераход: у 60 кіламетрах ад аг.Дзешчанка ў прыгарадзе Мінска знаходзіцца в.Азярцо,дзе мы наведаем Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, здзейснім заключную экскурсію на маршруце, пагуляем пад адкрытым небам і пазнаёмімся з народнай,традыцыйнай культурай Беларусі ў адзінстве яе рэгіянальных і лакальных асаблівасцей.* | | | | |
| На шляху аг.Дзешчанка да Азярца | | Панарама з вокнаў аўтобуса | | Расказаць аб асаблівасцях прыроды цэнтральных рэгіёнаў Беларусі і яе ўплыве на забудову пасяленняў. |
| В.Азярцо Мінскага раёна | Стаянка Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту | Навукова-эспазіцыйныя сектары: Центральная Беларусь, Паазер'е, Падняпроў'е. | 1г. 30мін. | Асаблівасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.<br>Расказаць пра асаблівасці забудоў, разгледзіць калекцыі музейных прадметаў. |
| *Заключэнне, падвядзенне вынікаў, адказы на пытанні экскурсантаў* | | | | |



Фота 120. Царква святых апосталаў Пятра і Паўла, г. Узда



Фота 119. На экскурсіі ў школьным музеі в. Дзешчанка



Фота 122. Музейны комплекс «Дудуткі»



Фота 123. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту